Інсцэніроўка ўрыўка з рамана

**Чытальнік 1.** Кірмаш. Збоку каля сцяны сядзіць сляпы лірнік. Ён спявае. Каля яго толькі дзве жанчыны, якія плачуць, і хлопец. Невысокі, каржакаваты, з цёмна-русымі прыгожымі валасамі. Рысы ў хлопца няправільныя, але буйныя і нават чымсьці прыгожыя. Цяжкаватае падбароддзе, вялікі цвёрды рот, жарскаваты няправільны нос… Невялікія, сінія з залатымі іскрынкамі вочы хлопца … задумлівыя і мяккія. Пасма валасоў падае на высокі чысты лоб. Ён слухае. Слухае, нахмурыўшы тонкія і чорныя, нібы тушшу наведзеныя, бровы…

Жабрак змоўк. Хлопец цяжка, быццам ад сну адрываючыся, уздыхнуў і кінуў на ліру тры медныя капейкі… I раптом вочы сталі іранічныя і трошкі злосныя: убачыў, што гожы падлетак з шэрымі вачыма хоча пакласці на ліру срэбны паўрубель.

К а с т у сь. Здурэў, ці што?

А л е с ь. Цябе не спыталі.

К а с т у с ь. Яно і відаць, што з залатых каптаноў. Галоўка як макаўка, а розуму – як…

А л е с ь. Ты б паўтарыў…

**2-і чытальнік**. Слова за слова, і праз хвіліну яны ўжо малацілі адзін аднаго з усёй заўзятасцю падлеткаў. Пыл так і курэў, над месцам бойкі. Урэшце яны стаміліся і, сапучы, стаялі, насцярожана сочачы адзін за адным.

К а с т у с ь. Атрымаў?

А л е с ь. Дый ты атрымаў.

К а с т у с ь. Ну і што?

А л е с ь. А тое, што дурань.

К а с т у с ь. Гэта ты дурань. Старога за твой паўрубель маглі б у паліцыю павесці. У бедных людзей бываюць толькі медныя грошы.

А л е с ь. Ты хто такі?

К а с т у с ь. А табе што?

А л е с ь. Ну хто? Паляк? Мазур?

К а с т у с ь. Беларус.

А л е с ь. Што-о? Адкуль гэта ты даведаўся? Гэта ж я адкрыў. Гэта я – беларус.

К а с т у с ь. Адзін Гаўрыла ў Полацку. Тут усе беларусы. А ён адкрыццё зрабіў… Першы… Знайшоўся мне яшчэ – Капернік.

А л е с ь. Але ж я ведаю толькі траіх, якія адказалі мне так. У астатніх няма імя…

**1-ы чытальнік**. Алеся цяпер цягнула да гэтага хлопца. Таму што ён, не ведаючы Алесевых думак, прыйшоў да таго самага.

К а с т у с ь. Я шкадую, што цябе стукнуў.

А л е с ь. І я таксама шкадую.

К а с т у с ь. Ты адкуль такі?

А л е с ь. З Дняпра. А ты?

К а с т у с ь. Давай знаёміцца, ці што?

А л е с ь. Давай. Я – Алесь Загорскі.

К а с т у с ь. Кастусь Каліноўскі.